# ОСОБЕННОСТИ НАЦИОНАЛЬНОГО МЫШЛЕНИЯ В МЕЖКУЛЬТУРНОМ ОБЩЕНИИ

**УДК [ 792:654.19 ](476)**

**Трапянок У.А.**

## АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁТЭАТРА ЗА АПОШНЯЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ

*Статья посвящена современному периоду функционирования белорусского радиотеатра, его тематике, проблемам, достижениям. Автор пишет о всех созданных за последние 10 лет радиоспектаклях, приводит сведения об их создателях, исследует наличие радиодрамы в эфире двух каналов Белорусского радио – Первого национального и канала «Культура».*

*Ключевые слова: белорусский радиотеатр, радиодрама, белорусское радио.*

**Trapianok U.A.**

## PECULIARITIES OF DEVELOPMENT OF BELARUSIAN RADIO DRAMA IN LAST TEN-YEAR PERIOD

*This article is about modern period of belarusian radio drama, about subjects, problems and achievements. The author writes about all recording performances during last 10 years, about creative persons and about presence of radio drama on the 2 channels of Belarusian radio – First national channel and channel «Culture».*

*Keywords: belarusian radio drama, Belarusian Radio.*

У пачатку 2000-х гг. беларускі радыётэатр, гісторыя якога налічвала амаль 7 дзесяцігоддзяў, аказаўся на мяжы закрыцця. Прычынамі сталі тэхнічныя і структурныя рэформы на Беларускім радыё: ішло пераасншчэнне студый камп'ютарным абсталяваннем, замест Першай і Другой праграм пачалі трансляцыю Першы нацыянальны канал (ПНК) і канал «Культура». Структурныя адзінкі падзялілі паміж сабой функцыі: прыярытэтнымі для ПНК сталі грамадска-палітычныя; функцыі асветы, гутаркі, адукацыйная і эстэтычная ўскладзены на канал «Культура» [1, с. 38]. «Культура» пачала папулярызацыю нацыянальнага і замежнага мастацтва, літаратуры. На гэтым канале звярнуліся да традыцыйнага для Беларускага радыё «літаратурнага тэатра», калі перад мікрафонам твор агучвае адзін выканаўца, у эфіры з'явіліся папулярныя па сённяшні дзень перадачы «Літаратурная анталогія» з чытаннем твораў айчынных празаікаў і «Бестселер» з агучанай спадчынай замежных аўтараў. На ПНК у пачатку 2000-х гг. існавала рубрыка «Кароткія гісторыі», якая прапаноўвала слухачам аўдыяапавяданні. Драматычныя творы не запісваліся ўвогуле, пачуць фондавыя спектаклі можна было ў штотыднёвай перадачы «Тэатр перад мікрафонам». І ўсё ж, радыётэатр аднавіўся. У гэтым артыкуле мы даследуем найноўшыя гады яго функцыянавання, выяўляем тэматычную разнастайнасць, асноўныя здабыткі і праблемы. Для вывучэння тэмы мы праінтэрв'юіравалі творчых супрацоўнікаў Беларускага радыё.

Годам адраджэння радыётэатра стаў 2006 г. Да 20-годдзя катастрофы на ЧАЭС кіраўніцтва Беларускага радыё ініцыіравала пастаноўку п'есы В. Ткачова «Нехта ходзіць пад акном». За пастаноўку «Ігнатаў рубеж» узяўся рэжысёр А. Вінярскі. Менавіта гэты аўдыятвор акрэсліў спецыфіку далейшай працы: пастаноўкі пачалі прымяркоўваць да юбілейных дат, рэжысёры (іх штат у пач. 2000-х гг. зведзены да мінімуму) у сваёй дзейнасці прытрымліваюцца традыцый папярэдніх пакаленняў радыёрэжысёраў; ролі ў пастаноўках выконваюць запрошаныя артысты мінскіх тэатраў. Галоўную ролю Ігната ў радыёспектаклі «Ігнатаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рубеж» выканаў народны артыст СССР, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Г. Аўсяннікаў. Спектакль апавядае гісторыю недарэчна абарванага жыцця сталага чалавека, якога сілком спрабуюць перавезці з забруджанай тэрыторыі на новае месца жыхарства, але той прымае рашэнне застацца на роднай зямлі трагічным шляхам і падпальвае дома, у якім знаходзіцца да апошняй хвіліны. Вылучаюць спектакль псіхалагічна напружаныя акцёрскія работы Г. Аўсяннікава, М. Захарэвіч.

У 2007 г. да 125-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы рэжысёр Р. Патака паставіла спектакль паводле твора «Паэт і дзяўчына» беларускага літаратара П. Васючэнкі, які дэбютаваў у якасці радыедраматурга. Спектакль пабудаваны на ўспамінах сталай Паўліны Мядзёлка – каханай паэта. Ролю выканала актрыса Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага А. Пастрэвіч. У якасці маладой Паўліны выступіла актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Ю. Шпілеўская. Ролю Паэта агучыў акцёр Беларускага дзяржаўнага маладзежнага тэатра А. Шароў. «Паэт і дзяўчына» – гэта дакументальна-мастацкая гісторыя кахання, якую вылучаюць паэзія Я. Купалы, музыка, спецыяльна напісаная для пастаноўкі кампазітарам Л. Захлеўным, і лірычныя інтанацыі выканаўцаў галоўных роляў.

У 2009 г. на Беларускім радыё паставілі два спектаклі. Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рэдактар Г. Шаблінская інсцэніравала для радыё аповесць В. Быкава «Пастка». Аднайменны спектакль паставіў рэжысёр А. Вінярскі. Па сюжэце твора малады лейтэнант Клімчанка апынаецца ў пастцы, калі трапляе ў палон да немцаў. Ворагі даруюць яму жыццё, але навешваюць на лейтэнанта ярмо «здрадніка» перад сваімі. Невінаваты камандзір вяртаецца ў сваю роту ў новай якасці. Галоўную ролю ў радыёспектаклі выканаў артыст Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы А. Кавальчук. Вартасць спектакля палягае ў данясенні да радыёслухача горкай праўды, якую спавядаў у сваёй творчасці В. Быкаў.

Рэжысёр Л. Пташук у 2009 г. звярнулася да п'есы айчыннага драматурга А. Дударава «Крыж» і дадала ў фонд беларускага радыётэатра аднайменны твор на духоўную тэматыку. Пастаноўку прысвяцілі 100-годдзю вяртання на радзіму мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Ролі ў радыёспектаклі выконвалі артысты Г. Гарбук, А. Лясная, А. Душачкін, М. Кірычэнка. Музыка да аўдыятвора была спецыяльна напісана беларускім кампазітарам У. Кандрусевічам, музычна-шумавым афармленнем займалася гукарэжысёр Л. Гаршунова.

Яшчэ адной работай на духоўную і гістарычную тэму стаў радыёспектакль паводле твора У. Сыракомлі «Магнаты і сірата. Соф'я, князёўна Слуцкая». Дзеянне ў спектаклі адбываецца ў Вільні ў 1600 г. Аўдыятвор пастаўлены да 420-годдзя з дня нараджэння славутай князёўны, абаронцы праваслаўя на беларускіх землях [2]. Радыёспектакль вызначаецца зладжаным акцёрскім ансамблем. Галоўныя ролі ў ім выконвалі артысты Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы К. Яворская і А. Гарцуеў.

Практыку адаптацыі для радыёэфіру твораў, запісаных са сцэнічных падмосткаў, у 2011 г. аднавіла рэжысёр Л. Пташук. Яна перанесла на электронныя носьбіты спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Тутэйшыя» паводле Я. Купалы ў пастаноўцы М. Пінігіна. Актуальнасць п'есы, напісанай у 1922 г., выдатныя акцёрскія работы, наватарскі рэжысёрскі падыход М. Пінігіна зрабілі спектакль адным з найпапулярнейшых у афішы тэатра. Зараз «Тутэйшыя» знятыя з рэпертуару, але захоўваюцца ў аўдыяварыянце на Беларускім радыё. На нашу думку, радыёверсіі не хапае выразнасці ў адлюстраванні падзей для ўспрымання на слых. Разам з тым, у запісе зафіксавана прафесійная работа карыфеяў сучаснага прафесійнага тэатра (В. Манаеў, М. Захарэвіч, Г. Аўсяннікаў, А. Памазан, А. Падабед, Н. Качаткова, З. Белахвосцік і інш.). Радыёспектакль «Тутэйшыя» прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы і 90-годдзю з часу напісання п'есы [3].

У снежні 2012 г. у эфіры Першага нацыянальнага канала да 130-годдзя народнага паэта Беларусі Я. Коласа адбылася прэм'ера спектакля «Адгукніся, браце» паводле п'есы драматурга Г. Марчука. Аўдыятвор пазнаёміў радыёслухача з малавядомымі фактамі з жыцця



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класіка: гадамі, праведзенымі ў мінскім астрозе, перыядам творчага станаўлення будучага класіка. Пастаноўшчыкам радыёспектакля выступіў прыхільнік рэалістычнага накірунку радыёрэжысуры А. Вінярскі. Для выканананія роляў у пастаноўцы былі запрошаны акцёры мінскіх тэатраў: А. Кавальчук, С. Зелянкоўская, У. Рагаўцоў, А. Памазан, Г. Аўсяннікаў, М. Захарэвіч, Б. Барысёнак, А. Душачкін, У. Мішчанчук, Т. Гуляева і інш.

70-годдзю вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвечаны спектакль «Млечны шлях» паводле аднайменнага рамана К. Чорнага. Тэмай пастаноўкі з'яўляецца вайна вачыма сўрапейцаў. На чале творчага працэсу стаяў рэжысёр А. Вінярскі. Інсцэніраваў твор для радыё літаратуразнавец П. Васючэнка, які раней адаптаваў творы для радыё. Ён увёў новага персанажа – самога пісьменніка Кузьму Чорнага, які ў спектаклі выступае ад аўтара. Над стварэннем персанажаў у радыёпастаноўцы былі задзейнічаны прафесійныя артысты мінскіх тэатраў, якія ўжо мелі багаты вопыт запісаў на радыё: Г. Аўсяннікаў, В. Манаеў, А. Памазан, М. Захарэвіч, М. Кірычэнка, А. Душачкін, У. Мішчанчук і інш. Ідэя ўвасобіць твор для радыё належыць Г. Шаблінскай, якая была рэдактарам у іншых радыёспектаклях апошняга дзесяцігоддзя. У гутарцы Г. Шаблінскай з намі аб пастаноўцы «Млечны шлях» стала вядома, што праца над складаным матэрыялам ішла нялёгка, але вынік уразіў многіх: прадстаўнікі літаратурнай і тэатральнай эліты краіны назвалі пастаноўку найлепшай работай радыётэатра за апошні час. Героямі спектакля з'яўляюцца прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, якія па-свойму ўспрымаюць вайну. Гэта героі-сімвалы, якіх аб'ядноўвае жаданне жыць у міры, што робіць іх блізкімі і зразумелымі для слухачоў радыёспектакля, а значыць, надае аўдыятвору актуальнае гучанне і важнасць у данясенні да аўдыторыі ідэй міру, братэрства і еднасці.

У маі 2015 г. да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў радыёэфіры ПНК адбылася прэм'ера радыёспектакля «... І няма шляху чужога» паводле аднайменнай аповесці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі пісьменніка У. Саламахі. Дзеянне ў творы адбываецца ў апошні год Вялікай Айчыннай вайны. У аснову аповесці пакладзены трагічны лёс старога чалавека Іосіфа Кучынскага са спаленай карнікамі беларускай вёскі Гуда, якому наканаваны шлях ізгоя, таму што ён з'яўляецца бацькам паліцая. Абставіны ваеннага часу фарміруюць складаныя супярэчлівыя адносіны галоўнага героя з яго аднавяскоўцамі, але застаецца надзея на разуменне і дараванне [4]. Радыёспектакль насычаны масавымі сцэнамі, што робіць яго адметным сярод іншых пастановак апошняга дзесяцігоддзя. Атмасферу ваеннага вакзала, базару, раз'юшанага натоўпу і інш. рэплікамі, крыкамі, гоманам дапамаглі стварыць артысты Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі». На ролі ў спектаклі рэжысёр А. Вінярскі запрасіў вядомых артыстаў Г. Аўсяннікава, С. Жураўля, А. Памазана, М. Кірычэнку, М. Захарэвіч, У. Мішчанчука, А. Сідараву і інш., што сведчыць пра якасна сыграныя вобразы герояў аўдыятвора.

У эфіры Першага нацыянальнага канала і канала «Культура» транслююцца фондавыя радыёспектаклі, запісаныя ў 1950–1990-я гг. Загадчык аддзела літаратурна-мастацкіх праграм ПНК Г. Шаблінская з'яўляецца аўтарам перадачы «Тэатр Беларускага радыё», якая выходзіць у эфір кожны дзень. Канал «Культура» трансліруе фондавыя спектаклі па выхадных днях у праграмах «Радыётэатр. Ленінас» (аўтар У. Трапянок знаёміць слухачоў з гісторыяй беларускага радыётэатра, творчымі біяграфіямі рэжысёраў, акцёраў, распавядае пра ўвасабленне п'ес на сцэне, на радыё, на тэлебачанні) і «Радыётэатр плюс». Для дзіцячай аўдыторыі на канале «Культура» спектаклі з фондаў гучаць у праграме «Мэры Попінс» кожную пятніцу.

Такім чынам, у 2006 г. пачаўся перыяд адраджэння беларускага радыётэатра. У сярэднім, кожны год за кошт сродкаў Першага нацыянальнага канала запісваецца па адным творы, выхад прымеркаваны да юбілейнай даты ці падзеі. Над радыёспектаклямі працуе калектыў прафесійных літаратараў, рэжысёраў, гукарэжысёраў і запрошаных артыстаў мінскіх тэатраў. Тэмы пастановак апошняга дзесяцігоддзя разнастайныя (гістарычная, духоўная, тэма выбару, здрады, адданасці роднай зямлі), прымушаюць гледача пераасэнсоўваць перажытыя падзеі па-новаму (радыёспектакль «Пастка»). Аднак цяперашняму радыётэатру Беларусі не хапае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучаснага падыходу ў агучванні тэм, блізкіх нашаму часу, праблем, што хвалююць, напрыклад, маладое пакаленне. Выдаткі для сённяшняга радыётэатра не дазваляюць ператварыць яго ў эксперыментальную пляцоўку, дзе свае творчыя сілы маглі б праявіць маладыя ці зацікаўленыя рэжысёры і акцёры. Тым не менш, дастатковая колькасць перадач, якія транслююць радыеспектаклі, сведчыць пра запатрабаванасць радыёспектакляў; пераход вяшчання радыёканалаў у сетку інтэрнэт дазваляе далучыць да радыёдрамы новыя групы слухачоў, а прыклады мастацкага радыёвяшчання суседніх краін, спадзяёмся, паспрыяюць развіццю беларускага радыётэатра.

**Спіс літаратуры:**

1. Курейчик. А. Современная структура Белорусского радио: поиск оптимальной модели / А. Курейчик // Беларускае радыё: гісторыя, сучаснасць, перспектывы развіцця: матэр. рэспубл. навук.-практ. канф., прысвечанай 80-годдзю Беларускага радыё / рэдкал.: С.В. Дубовік (алк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 37–39.
2. Праз 150 гадоў // Газета «Культура» [Электронны рэсурс]. – 2015. – Рэжым доступу: http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&id=4030.
3. К юбилею Купалы подготовлен радиоспектакль «Тутэйшыя» // Интернет-портал Национальной библиотеки Беларуси [Электронны рэсурс]. – 2011. – Режим доступа: http://www.nlb.by/portal/page/portal/index/detailed_news?param0=36931&lang=ru&rubricId=2.
4. Прэм'ера спектакля на Беларускім радыё // Белтэлерадыёкампанія [Электронны рэсурс]. – 2015. – Рэжым доступу: http://www.tvr.by/bel/company/prem-era-spektaklya-na-belarusk-m-radyye.

*Трепенок Владимир Анатольевич*
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

**УДК 398.3**

**Стрыжак В.Н.**

# РЕГИОНАЛЬНЫЙ АСПЕКТ НАРОДНЫХ СЕМЕЙНЫХ ТРАДИЦИЙ (НА МАТЕРИАЛАХ ФОЛЬКЛОРНЫХ ЭКСПЕДИЦИЙ)

*В статье рассматриваются локально-региональные особенности семейной обрядности жителей исторической Уманщины, в частности, представлены приметы и народные поверья, связаные с успешной беременностью и правильным уходом за младенцем, анализируются мотивы, образы колыбельных песен, потешек, закличек, детских игр, раскрываются их функции, а также педагогический потенциал.*

*Ключевые слова: народное семейное воспитание, этнопедагогика, детский фольклор.*

**Stryzhak V. H.**

# REGIONAL ASPECT OF FOLK FAMILY TRADITION (BASED ON THE MATERIALS OF FOLKLORE EXPEDITIONS)

*The author in the article deals with local and regional features of family rituals of historical Uman region, in particular we can see the beliefs that relate to successful pregnancy and proper baby care. The motives and images of lullabies, potishky, zaklychky and children's games were analyzed, their functions and pedagogical potential were shown.*

*Keywords: national family education, ethnopedagogy, child folklore*

Неотъемлемой частью культуры любой нации является народная семейная педагогика (эмпирические знания народа о воспитании). Она отражается в обычаях и обрядах, связанных с жизнью детей и молодежи, в фольклоре, играх и игрушках, в традициях семейного и общественного воспитания. Украинский народ на протяжении многих веков вырабатывал целостную систему воздействия на формирование личности. Следует отметить, что воспитательная практика в разных регионах Украины порождала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ